В погоне за волчком

У Беларусі нарэшце з'явіўся сакаліны заказнік. Дарэчы, першы і пакуль што адзіны, створаны для захавання папуляцыі пустальгі.

Спецыялісты вядомай грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" дапускаюць, што і ў Еўропе ён можа быць адзіным.

Цікава, што не дзе-небудзь у патаемным і маладаступным месцы, а па-суседству з людзьмі, на самым што ні ёсць відавоку.

І ў дадатак побач з мегаполісам-сталіцай.

А калі дакладней, у пасёлку ваенных авіятараў — Мачулішчах, дзе час ад часу ад узлёту цяжкіх самалётаў дрыжаць і зямля, і паветра.

У невялікім, але даволі старым хвойніку, абапал дарогі, якая вядзе з чыгуначнага прыпынку да жылога шматпавярховага квартала, гняздзіцца каля дзясятка пар птушкі-чырванакніжніцы. Спытаеце, чаму падкрэсліваю слова "нарэшце"? А таму, што дзесяць гадоў вялося сапраўднае змаганне за наданне гэтаму куточку ахоўнага статусу. Ідэя сыходзіла ад мачулішчанскіх школьнікаў — членаў клуба аматараў прыроды "Біяразнастайнасць", якія яшчэ ў 2000 годзе выявілі гэтую рэдкую птушыную калонію і навукова абгрунтавалі неабходнасць захавання мясцовай папуляцыі. Адна са школьных навуковых прац была настолькі моцнай і пераканаўчай, што яе аўтарка Таццяна Каравай атрымала нават прэзідэнцкую стыпендыю.

Амаль пяць гадоў таму быў выраблены гэты плакат-аншлаг з выявай птушкі і назвай заказніка, а ў пачатку верасня падчас прыезду валанцёраў на ўборку тэрыторыі быў нарэшце ўсталяваны.

— Для многіх жыхароў нашага пасёлка гэта вельмі значная падзея, бо яны таксама дапамагалі берагчы і ахоўваць унікальны куток, — кажа спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Руслан Шайкін. — Для многіх будзе нечаканасцю ўбачыць і прачытаць гэтую інфармацыю, бо цяпер тут нельга, як раней, разводзіць вогнішчы, кідаць смецце, шумець. Многія ж прывыклі жыць менавіта так.

Другі год запар на тэрыторыі сокала-пустальгі (а гэта менавіта птушыная тэрыторыя) адбываюцца акцыі па зборы смецця. У акцыі ёсць і свая назва — "Узляці высока!". Распачалі яе ўстанова вядомых прафесійных конкурсаў "Брэнд году" і кансалдынгавая кампанія Satio. Маладыя людзі збіралі смецце, якое накоплівалася тут гадамі ці засталося пасля нядаўніх нядбалых адпачывальнікаў. Да валанцёраў далучыліся ахвочыя з фабрыкі "Мілавіца", Мінскага рэзервовага банка, іншых сталічных кампаній. Вядома, не засталіся ў баку мясцовыя школьнікі. А прадпрыемства "Пінскдрэў" не толькі даслала сваіх прадстаўнікоў, але і выдаткавала матэрыял для стварэння скрынь — штучных гнёздаў.

— Цяпер гэта не проста тэрыторыя, важная для птушак, а ахоўваемая дзяржавай, — падкрэслівае былы школьны настаўнік-біёлаг з Мачулішчаў і колішні кіраўнік клуба "Біяразнастайнасць" Руслан Шайкін. — Ахоўваць "Сакаліны" зусім не цяжка, бо гэта адзін з самых маленькіх па тэрыторыі ў нашай краіне заказнікаў — усяго дваццаць з невялікім гектараў.

Іван ЛУЖЫНСКІ

Источник: Родная прырода.-2011.-№10.-С.17.